

Emmaus

Бюлетэнь рымска-каталіцкай парафіі

Маці Божай Бялыніцкай г. Горкі

№ 19-2014, 15.06.2014

PDF–архіў на сайце www.kasciol.by

**Роздум:**

# Таямніца Святой Тройцы



«У імя Айца, і Сына, і Духа Святога» — такімі словамі хрысціяне пачынаюць свае малітвы, новую справу, новы дзень. Гэты кароткі сказ сам па сабе з’яўляецца малітвай і перадае глыбокую таямніцу хрысціянскай веры. Мы верым у аднаго Бога ў трох Асобах — у Тройцу. На разважанне над гэтай праўдай натхняе нас адпаведнае свята, якое Каталіцкі Касцёл будзе адзначаць у бліжэйшую нядзелю.

Ніводная іншая рэлігія, апрача хрысціянства, не сцвярджае нічога падобнага — што Бог адзін, але адначасова ў трох Асобах. Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што вера ў тры Божыя асобы — гэта адметная рыса хрысціяніна. Таму той, хто не верыць, што Бог — гэта Бог Айцец, Хрыстос і Дух Святы, не мае ў сабе хрысціянскай веры.

Многія ведаюць малітву да Тройцы: «Хвала Айцу, і Сыну, і Духу Святому. Як было спрадвеку, цяпер і заўсёды, і навекі вечныя. Амэн». У лацінскім абрадзе ў дзень Святой Тройцы ў літургіі так выражаецца хрысціянская вера: «Вызнаючы сапраўднае і вечнае Боства, мы ўшаноўваем тры Божыя Асобы, адной сутнасці і роўнай велічы».

Чалавечаму розуму цяжка зразумець трыадзінасць Бога. Гэта адна з Божых таямніц, якую мы можам спасцігаць, але ніколі да канца не спасцігнем. Дзецям спрабуюць тлумачыць таямніцу Тройцы з дапамогай вобразаў. Напрыклад, калі запаліць тры свечкі і нахіліць іх адна да адной, то свечкі будуць тры, але агонь у іх — адзін. Аднак гэта толькі недасканалы вобраз. Святы Патрык, апякун Ірландыі, прапаведуючы язычнікам, спрабаваў данесці ім праўду аб Тройцы, паказваючы лісток канюшыны. Лісток, які падзяляецца на тры часткі. Тры часткі, але лісце адно — яшчэ адзін вобраз трыадзінства Бога. Пазней трыліснік стаў сімвалам Ірландыі.

Толькі сваім розумам чалавек ніколі б не дайшоў да веры ў Тройцу. Хрыстос абʼявіў нам гэтую праўду. У Бібліі слова «Тройца» ніколі не ўжываецца, але ў розных месцах узгадваецца Бог у Трох Асобах. Перад узыходжаннем на неба Езус кажа апосталам: «Ідзіце і навучайце ўсе народы, хрысцячы іх у імя Айца, і Сына, і Духа Святога» (Мц. 28, 19). Другое Пасланне да карынцянаў заканчваецца словамі: «Ласка Пана нашага Езуса Хрыста, і любоў Бога Айца, і еднасць у Духу Святым няхай будуць з усімі вамі» (2 Кар. 15, 13).

Асобны ўспамін у літургіі ў гонар Святой Тройцы ўзнік у заходняй хрысціянскай традыцыі дастаткова позна, толькі ў XI стагоддзі. Тут трэба растлумачыць адзін момант. На пяцідзясяты дзень пасля Вялікадня (Пяцідзясятніца) заходняя хрысціянская традыцыя адзначае ўрачыстасць Спаслання Духа Святога, а ўсходняя (візантыйская) — урачыстасць Тройцы. Свята ж Тройцы рыма-каталікі адзначаюць у наступную нядзелю пасля Пяцідзясятніцы. Сумеснае суіснаванне дзвюх традыцый у Беларусі і адначасова іх няведанне прыводзіць да некаторых непаразуменняў з усведамленнем дзён святкаванняў. У Беларусі свята Тройцы ў заходнім абрадзе зʼяўляецца нібы працягам святкавання Пяцідзясятніцы.

кс. Кірыл Бардонаў, www.ng.by

**Урачыстасць Найсвяцейшай Тройцы**

На гэтым тыдні расклад багаслужэнняў будзе наступны:

- ✓ у панядзелак, сераду, пятніцу - святая Імша ў 18.00
- ✓ у аўторак – святая Імша у 10.00
- ✓ у чацвер – у 19.00
- ✓ у нядзелю – святая Імша ў 16.00

<u>у літургіі успамінаем:</u>

- ✓ 19.06. – **урачыстасць Найсвяцейшага Цела і Крыві Хрыста (Божае Цела).** Ва ўрачыстасць Божага Цела Касцёл складае падзяку Збаўцу за дар Найсвяцейшага Сакрамэнту, у якім Ён сам прабывае для свайго народа.
- ✓ 21.06. – **успамін св. Алаізія, законніка.** Нарадзіўся 9 сакавіка 1568 г. на поўначы Італіі. Глыбокая пабожнасць і суровы лад жыцця спалучаліся ў Алаізія з вялікаю любоўю да хворых і да ўсіх, каму была патрэбная дапамога. Падчас эпідэміі чумы, якая лютавала ў Рыме, ён аддана дапамагаў хворым і клапаціўся пра годнае пахаванне тых, хто загінуў ад пошасці. У выніку Алаізій заразіўся сам і памёр 21 чэрвеня 1591 г. ва ўзросце 23 гадоў. Святы Алаізій Ганзага з'яўляецца апекуном моладзі і студэнтаў, а таксама тых, хто выбірае свой жыццёвы шлях. Яго заступніцтва просяць пры заразных хваробах і хваробах вачэй.

у нашай парафіі адбываюцца **чэрвеньскія набажэнствы** – штодзённая малітва Літаніяй да да Найсвяцейшага Сэрца Езуса Хрыста.

У наступную нядзелю, **22 чэрвеня, у Магілёве плануецца працэсія Божага Цела** вуліцамі горада. Пачатак – святая Імша ў 11.00 у катэдры.

Дзякую Вам, дарагія браты і сёстры, за супольную малітву. Няхай Добры Бог узнагародзіць вашую шчодрасць і дабрыню. Добрага перажывання нядзелі і плённых дзён працы.

тэл: **8-029-880-99-19** (*кс. Андрэй*)

# Ян 3, 16–18

*Паслаў Бог Сына свайго, каб свет быў збаўлены праз Яго*



+ Чытанне святога Евангелля паводле Яна.

**Бо так палюбіў Бог свет, што аддаў Сына свайго Адзінароднага, каб кожны, хто верыць у Яго, не загінуў, але меў жыццё вечнае. Бо не паслаў Бог Сына свайго ў свет, каб судзіць свет, але каб свет быў збаўлены праз Яго. Хто верыць у Яго, не будзе асуджаны, а хто не верыць, той ужо асуджаны, таму што не паверыў у імя Адзінароднага Сына Божага.**

Гэта слова Пана.

*Бог палюбіў нас… Палюбіў настолькі, што аддаў за нас жыццё…*

*Любоў - падмурак ўсёй задумы Божай аб збаўленні нашым у Хрысце. Слова Божае гаворыць нам пра любоў. Бог наш ёсць любоў. Усё ў свеце – і неба, і зямля, не толькі закон і прарокі – грунтуецца на любові. Скасуецца закон любові, і ўсё рассыплецца. Усе прарокі гавораць пра любоў і жывуць любоўю, таму што толькі любоў відушчая.*

*Толькі любоўю можна бачыць тое, што адбываецца тут, на зямлі, і ў вечнасці. І толькі любоў робіць законнымі дачыненні між людзьмі. І нішто не з'яўляецца ў нашай веры сапраўдным, калі на першым месцы не знаходзіцца любоў.*

2014 © **Рымска-каталіцкая парафія Маці Божай Бялыніцкай г. Горкі**